ISSN 0203-2031

№10

# Адукацыя і Выхаванне

1999

У нумары

Маральныя каштоўнасці і нормы ў культуры грамадства

Сістэмны аналіз прафесійнай дзейнасці педагога

Адораныя дзеці: нацыянальны рэсурс і прыярытэт

Інавацыі ў сусветнай педагогіцы (кніга ў часопісе)

АіВ Адукацыя і Выхаванне



В.С.Болбас

# Таленавіты вучоны, здольны арганізатар

***Беларуская зямля ўзгадавала шмат таленавітых людзей, імёны якіх залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю цывілізацыі. Да ліку лепшых прадстаўнікоў нашага народа з поўным правам можна аднесці знакамітага вучонага, першага айчыннага астранома, актыўнага рэфарматара і арганізатара народнай асветы другой паловы XVIII — пачатку XIX ст. Марціна Пачобута-Адляніцкага. Пра яго — гэты матэрыял.***

Нарадзіўся Марцін Пачобут 19 (30) верасня 1728 г. у радавітай, але збяднелай шляхецкай сям'і ў маёнтку Пачобудзе вёскі Саломенка былой Горніцкай воласці (зараз Капцёўскі сельсавет Гродзенскага раёна). У час першапачатковай дамашняй адукацыі бацькі заўважылі ў хлопчыка надзвычайныя здольнасці да навукі і ў 1738 г. аддалі яго ў Гродзенскі езуіцкі калегіум. У гэтай навучальнай установе інтэрнатнага тыпу езуіты імкнуліся даць сярэднюю адукацыю агульнаеўрапейскага ўзору. Пасля сямі гадоў вучобы Марцін у ліку лепшых выпускнікоў калегіума паступае ў Віленскую езуіцкую акадэмію. Малады чалавек вырашае прысвяціць сваё жыццё навуцы і асвеце.

Пасля заканчэння вышэйшай навучальнай установы юнак працуе настаўнікам у Полацку. Імкненне да папаўнення ведаў падштурхоўвае яго працягваць адукацыю. Марцін едзе ў Прагу, дзе ў старажытным універсітэце Еўропы вывучае грэчаскую мову і матэматыку. Пасля вяртання ў 1756 г. на радзіму ён прызначаецца на пасаду прафесара грэчаскай мовы Віленскай акадэміі.

Праца ў акадэміі якраз прыпадае на перыяд шырокага распаўсюджвання ідэй эпохі Асветніцтва. Як і іншыя асветнікі таго часу, М.Пачобут лічыў, што глыбокае спасціжэнне законаў прыроды дапаможа ўсвядоміць заканамернасці і асноўныя напрамкі грамадскага ўладкавання. А значыць, з дапамогай асветы можна будзе пераўтварыць увесь свет. Шырокая дасведчанасць у дакладных і прыродазнаўчых навуках дазваляла маладому выкладчыку ўключаць у свае лекцыі звесткі з геаграфіі, астраноміі, прыродазнаўства.

З мэтай актывізацыі навукова-даследчай дзейнасці М.Пачобут схіляе кіраўніцтва акадэміі запланаваць стварэнне ўласнай астранамічнай абсерваторыі. У 1761 г. ён накіроўваецца ў замежную камандзіроўку для паглыбленага вывучэння астраноміі і набыцця абсталявання для будучай абсерваторыі. На працягу трох гадоў удасканальваў веды ў Германіі, Італіі і Францыі. Некаторыя вынікі яго першых астранамічных назіранняў у абсерваторыях Марселя, Авіньёна і Неапаля былі апублікаваны ў 1763 г. французскім астраномам Э.А.Паліянам у кнізе "Мірны дагавор паміж Дэкартам і Ньютанам". Вярнуўшыся ў Віленскую акадэмію, М.Пачобут становіцца прафесарам астраноміі і матэматыкі.

У 1765 г. здзяйсняецца мара вучонага — пры акадэміі ствараецца цудоўна абсталяваная астранамічная абсерваторыя. М.Пачобут прызначаны яе дырэктарам (гэтую пасаду ён займаў да 1807 г.). Таленавіты вучоны і здольны арганізатар стварыў дружны, працаздольны калектыў, сапраўдную навуковую школу, якая ўнесла істотны ўклад у развіццё астранамічнай навукі. З 1769 г. у Віленскай акадэміі арганізуюцца пастаянныя назіранні і вывучэнне зорнага неба. Ход даследаванняў падрабязна апісваўся ў "Журналах

назіранняў" ("Chaiers des observationis"). Каштоўны навуковы матэрыял склаў некалькі дзесяткаў тамоў. Лёс іх досыць складаны. Як адзначаюць навукоўцы, яны беражліва захоўваліся паплечнікамі і людзьмі, якія працягвалі справу М.Пачобута. Частка матэрыялаў, верагодна, загінула ў час пажару, што здарыўся ў абсерваторыі. Пасля закрыцця ў 1832 г. Віленскай акадэміі "Журналы назіранняў" былі вывезены ў Пецярбург, дзе пасля доўгіх блуканняў па розных інстанцыях нарэшце трапілі ў Пулкаўскую абсерваторыю. У арганізацыі іх захаванасці непасрэдна ўдзельнічаў знакаміты рускі астраном В.Я.Струве. У 1941 г. матэрыялы былі перададзены ў Архіў Акадэміі навук СССР у Ленінградзе (зараз Санкт-Пецярбург), дзе знаходзяцца і цяпер.

Сучасны беларускі вучоны Э.Дарашэвіч, які непасрэдна вывучаў матэрыялы даследаванняў Віленскай астранамічнай абсерваторыі, адзначае апантанасць, навуковы фанатызм М.Пачобута. Па яго сведчанні, у журналах няма ніводнага дня, калі б не фіксаваліся назіранні М.Пачобута і яго памочнікаў за зорным небам. Там крок за крокам можна прасачыць, як рабіліся спробы эмпірычным шляхам пранікнуць у таямніцы Сусвету. Так, у 1772 г. М.Пачобут заўважыў некалькі невядомых дагэтуль зорак, якія не былі ўнесены ні ў адзін астранамічны атлас. На працягу двух гадоў дэталёва і скрупулёзна вядзецца вывучэнне дадзенага месца нябеснай сферы. Нарэшце М.Пачобуту з дапамогай Ю.Міцкевіча і А.Стржэцкага ўдаецца знайсці зоркавую асацыяцыю. Пасля ўдакладнення каардынат, супастаўлення вынікаў шматлікіх назіранняў 9 жніўня 1773 г. астраномы фіксуюць яе адкрыццё. Новае сузор'е вучоныя назвалі Каралеўскі Цялец з-за падабенства з сузор'ем Цяльца Задыякальнага і ў гонар караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага (у літаратуры часта сустракаецца і назва Цялец Панятоўскага). Вынікі гэтай працы былі апублікаваны даследчыкамі ў 1777 г. у кнізе, выдадзенай у Вільні.

Дадзенае адкрыццё было прызнана сусветнай астранамічнай навукай. Яно зацверджана Парыжскай акадэміяй навук, дзе ў 1778 г. М.Пачобут выбіраецца членам-карэспандэнтам. Пазней ён становіцца членам Лонданскага астранамічнага таварыства.

Навуковая школа М.Пачобута становіцца вядомай у Еўропе. Яна падтрымлівае кантакты з навукоўцамі іншых краін. Асабліва плённым было супрацоўніцтва з астранамічнай абсерваторыяй Кракаўскага універсітэта, якой кіраваў вядомы польскі астраном і матэматык Ян Снядэцкі. Дарэчы, менавіта ён працягваў справу М.Пачобута, калі з 1807 па 1828 г. узначальваў Віленскую абсерваторыю.

М.Пачобут падзяляў ідэю аб існаванні мноства сусветаў і падтрымліваў гіпотэзу наконт іх планетарнай пабудовы. Аналізуючы ідэю англійскага астранома Вільяма Гертэля аб руху Сонечнай сістэмы адносна іншых сусветаў, беларускі вучоны заклікаў усіх даследчыкаў арганізаваць сумеснымі намаганнямі доўгатэрміновыя сістэматычныя астранамічныя назіранні. Штодзённа супрацоўнікі абсерваторыі М.Пачобута сачылі за планетамі Сонечнай сістэмы, становішчам сузор'яў, рухам нябесных цел. Вывучаліся плямы на Сонцы, сонечныя і месячныя зацьменні. Даследаваліся перамяшчэнні камет, спадарожнікаў планет. Вызначаліся і ўдакладняліся геаграфічныя каардынаты асобных пунктаў зямной паверхні, у прыватнасці гарадоў Вільня, Гродна і інш. У 1793 г. было арганізавана комплекснае даследаванне сонечнага зацьмення, якое адначасова з розных гарадоў назіралі вучоныя з Віленскай і Кракаўскай астранамічных абсерваторый. На падставе гэтых матэрыялаў была выдадзена арыгінальная праца "Разлік гродзенскіх назіранняў зацьмення Сонца, які правялі Пачобут і Снядэцкі 3 верасня 1793 г.".

Вынікі, атрыманыя ў Віленскай абсерваторыі, выкарыстоўваліся ў фундаментальных навуковых працах замежных вучоных. Вядомы французскі астраном Ж.Ж.Лаланду, абапіраючыся на разлікі віленскіх даследчыкаў, склаў шэраг астранамічных табліц. У сваёй кнізе "Астранамічная бібліяграфія разам з гісторыяй астраноміі ад 1781 да 1802" ён даў высокую ацэнку навуковай школе М.Пачобута, адзначыўшы яе важкі ўклад у развіццё астраноміі. Імя выдатнага айчыннага вучонага ўпамінаецца і ў паэме Адама Міцкевіча "Пан Тадэуш".

М.Пачобут быў не толькі таленавітым вучоным-астраномам, але і актыўным арганізатарам асветы ў родным краі. Апошняя чвэрць XVIII ст. увайшла ў гісторыю адукацыі на беларускіх землях як перыяд радыкальных школьных рэформ. У 1773 г. упершыню ў Еўропе на тэрыторыі Рэчы Паспалітай дзяржава пазбаўляе царкву манаполіі на асвету. Ствараецца прынцыпова новы орган кіраўніцтва адукацыяй — Эдукацыйная камісія (праобраз будучых міністэрстваў народнай асветы). Робіцца спроба пабудаваць адзіную цэнтралізаваную сістэму народнай асветы. На землях Вялікага княства Літоўскага навуковае, метадычнае і арганізацыйнае кіраўніцтва асветай ускладаецца на Віленскую акадэмію, якая рэарганізуецца ў Галоўную школу ВКЛ.

Менавіта ў гэты перыяд кіраўніцтва Галоўнай школай даручаецца М.Пачобуту. На пасадзе рэктара ён працаваў 23 гады. Гэта прытым, што кожныя 4 гады рэктар выбіраўся спецыяльным саветам, куды ўваходзілі ўсе прафесары,

прадстаўнікі ад студэнтаў розных факультэтаў і нават ад вучняў сярэдняй школы, утваранай пры вышэйшай навучальнай установе. З імем М.Пачобута звязана шмат дэмакратычных пераўтварэнняў, у прыватнасці шырокая выбіральнасць прафесарска-выкладчыцкага саставу, уключаючы рэктарат. Для непасрэднага кіраўніцтва выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю ў Галоўнай школе ствараюцца дзве калегіі — фізічных навук (медыцыны, прыродазнаўства, матэматыкі) і маральных (тэалогіі, філасофіі, гісторыі, літаратуры і права), надзеленыя шырокімі паўнамоцтвамі.

У аснове арганізацыі школьных рэформ пад кіраўніцтвам Эдукацыйнай камісіі ляжаў "Статут, прадпісаны камісіяй народнай асветы для акадэмій і школ Рэчы Паспалітай". У распрацоўцы гэтага дакумента актыўны ўдзел браў і М.Пачобут. Пасля падрыхтоўкі праекта Статута ў 1781 г. ён наладжваў праверкі (візітацыі) акруговых, падакруговых і парафіяльных школ Вялікага княства Літоўскага, сустрэчы з настаўнікамі. На месцах абмяркоўваліся і ўзгадняліся асобныя палажэнні будучага нарматыўнага акта, удакладнялася яго адпаведнасць рэальнаму стану асветы. Рэктар асабіста наведваў акруговыя і падакруговыя школы, дэталёва знаёміўся з арганізацыяй іх дзейнасці. Пасля больш чым года такой працы М.Пачобут стварае спецыяльную камісію, якая на працягу шасці тыдняў на штодзённых пасяджэннях абагульняла атрыманыя матэрыялы, і ў 1783 г. Статут быў зацверджаны і надрукаваны.

Як рэктар Галоўнай школы М.Пачобут непасрэдна кіраваў правядзеннем школьных рэформ на тэрыторыі ВКЛ. На беларускіх землях адкрылася больш за 20 школ, якія давалі сярэднюю адукацыю, а таксама значная колькасць вялікіх і малых прафесіянальных школ. Істотна мяняецца змест навучання. Павялічваецца ўдзельная вага прыродазнаўчых прадметаў і дакладных навук. Асноўным прынцыпам пабудовы новай сістэмы асветы становіцца сувязь школы з жыццём. Уся адукацыйная палітыка падпарадкоўваецца мэце фармавання высокамаральнай асобы.

М.Пачобут быў узорам дасканалай падрыхтоўкі вучонага адначасова ў гуманітарнай сферы, у прыродазнаўчых і дакладных навуках. Поспехі яго астранамічнай працы ў многім вызначаліся глыбокім веданнем матэматыкі. У прыватнасці, яму належыць грунтоўная праца "Пачатак геаметрыі". Спрабаваў свае сілы і ў літаратурнай дзейнасці: пісаў вершы на рускай і лацінскай мовах, публіцыстычныя артыкулы. На ўрачыстасцях, прысвечаных адкрыццю Віленскага універсітэта, прагучала яго ода, якая ўсхваляла адукацыю і навуку, заклікала адмовіцца ад злобы, спусташальных войнаў і скіраваць грамадскія намаганні на развіццё народнай асветы.

У сваіх светапоглядных уяўленнях, якія грунтаваліся на прызнанні вырашальнай ролі законаў прыроды, М.Пачобут набліжаўся да натуралістычных і матэрыялістычных ідэй. Усё свядомае жыццё ён займаўся распаўсюджваннем і папулярызацыяй прыродазнаўчых ведаў, у тым ліку і праз публікацыі ў газетах і часопісах ("Kalendarz Wilenski", "Kurier Litewski" і інш.).

Жыццёвы шлях Марціна Пачобута скончыўся 9 (20) лютага 1810 г. Але справу выдатнага вучонага працягвалі яго паплечнікі і вучні. Яго дзейнасць і творчасць аказалі вялікі ўплыў на фармаванне светапогляду такіх вучоных, як В.Карчэўскі, П.Славінскі, А.Шагін, А.Доўгірд, М.Глушневіч і інш. І ў сённяшніх дасягненнях навукі і адукацыі Беларусі адчуваецца ўклад першапраходцаў, сярод якіх пачэснае месца належыць М.Пачобуту.